Пролетары ўсіх краёў, злучайцеся!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК і Менскага АК ЛКСМБ

УМОВЫ ПАДПІСКІ:

1 месяц	30 кап.
3 месяцы	90 "
6 месяцаў	1 р. 80 "
1 год	3 р. 30 "

АДРАС РЭДАКЦЫІ: Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ: Комсамольская 25, тэлеф. № 903.

Кошт асобнага № — 2 кап.

№ 136 (1103) | СУБОТА, 14-га чэрвеня 1930 г. | ГОД ВЫДАНЬНЯ X.

ТЭЛЕГРАМА-МАЛАНКА

Таварышы юнкоры, комсамольцы, атрады лёгкай кавалерыі! Вясеньняя пасеўкампанія па БССР падыходзіць к канцу. Чакаем хутчэйшай прысылкі матар'ялу аб выніках пасеўнай кампаніі ў вашым саўгасе колгасе, вёсцы, сельсавеце, раёне, як пашырана плошча пад яравы клін у гэтым годзе ці выкананы пляны, як ідзе сеў тэхнічных і сілосных культур.

Пішэце, як удзельнічалі комсамольскія ячэйкі ў вясеньнім севе, якую дапамогу аказалі індывідуальным бядняцка-серадняцкім гаспадаркам, як ідзе падрыхтоўка да ўборкі сенакосу, ураджаю і асеньняй сяўбы.

З прывітаньнем рэдакцыя „Чырвонай Зьмены".

На XIII зьезьдзе КП(б)Б

Даклад тав. ГЕЯ аб рабоце Цэнтральнага Камітэту КП(б)Б

(Працяг. Пачатак гл. у № 135)

Каб скончыць разьдзел дакладу аб пытаньнях колектывізацыі сельскай гаспадаркі, я закрану адну яшчэ проблему, якая мае надзвычай вялікае гаспадарчае і палітычнае значэньне—проблему разьвіцьця ў нас жывёлагадоўлі.

У сувязі з перагібамі і скажэньнямі ў колгасным руху, заняпад зацікаўленасьці індывідуальнага селяніна да становішча сваёй гаспадаркі выявіўся ў тым, што парэзалі значную колькасьць жывёлы.

Улік, праведзены намі, дае лічбу (у пераводзе на буйную рагатую жывёлу) скарачэньня сялянскага гурту за апошні год на 17 проц. Але я павінен агаварыцца, што гэтыя даныя трэба лічыць, відавочна, паменшанымі і фактычнае скарачэньне гурту больш, чым паказвае гэтая лічба.

Скарачэньне гурту, зразумела, адаб'ецца на забясьпечаньні рабочых, і гэта ставіць перад намі ва ўвесь рост задачу вырашэньня жывёлагадоўчай проблемы.

Цэнтральны Камітэт УсеКП(б) яшчэ ў сьнежні мінулага году ўхваліў пастанову, у якой гаварыў:

„Пасьля збожжавай проблемы, на шляху вырашэньня якой партыя дабілася першых сур'ёзных посьпехаў, мясная проблема зьяўляецца важнейшай задачай эканамічнай палітыкі партыі і савецкай улады, без вырашэньня якое ня могуць быць ліквідаваны затрудненьні ў справе забясьпечаньня харчамі рабочае клясы".

Гэта важная задача эканамічнай палітыкі партыі набывае ва ўмовах БССР яшчэ больш важнае значэньне, таму што БССР—раён пераважна жывёлагадоўчы.

Бюро ЦК КП(б)Б вызначыла програму мерапрыемстваў (па лініі колгасаў і саўгасаў) па аднаўленьню і разьвіцьцю жывёлагадоўлі ў соцыялістычным сэктары сельскае гаспадаркі. Мы вылучылі спэцыяльны сьвінаводны саўхозны трэст, які і павінен будзе зьявіцца базай для больш шпаркага разьвіцьця сьвінаводзтва.

Мы вызначылі мерапрыемствы па разьвіцьцю сьвінагадоўлі, і па разьвіцьцю малочна-мясное гаспадаркі ў колгасах, якія ахапляюць 40.000 галоў рагатае жывёлы.

Перад зьездам і перад усімі мясцовымі работнікамі трэба паставіць пытаньне аб неабходнасьці самых уважлівых адносін да проблемы жывёлагадоўлі, як да пытаньня, якое мае вялізарнае гаспадарчае і палітычнае значэньне.

Між тым, увага партыйных організацый да проблемы жывёлагадоўлі прыцягнута далёка не ў выстарчальнай ступені. Мы ня бачым, каб нашы газэты ў сваіх зводках пісалі аб посьпехах, аб наступленьні на жывёлагадоўчым фронце.

Мы маем даволі значныя крэдыты на разьвіцьцё жывёлагадоўлі (агульная сума крэдытаў вызначаецца ў гэтым годзе ў 27,1 мільёна руб., на адно другое паўгодзьдзе—больш 16 мільёнаў руб.), але, аднак, у справе скарыстаньня гэтых крэдытаў з боку колгасаў і саўгасаў мы маем нездавальняючае становішча, бюрократычна халодныя адносіны, адносіны—спусьціўшы рукавы.

Яшчэ больш сумны, у поўным сэнсе гэтага слова, малюнак прадстаўляе сабой ход аднаўленьня і разьвіцьця жывёлагадоўлі ў індывідуальным сэктары сельскай гаспадаркі. Відавочна, і ў гэтым факце выявілася некаторая тэндэнцыя ігнараваць, недаацэньваць індывідуальны сэктар. Мы не павінны забываць, што ў цяперашні час мы маем на Беларусі 88,9 проц. сялянскіх двароў, якія працуюць па-ранейшаму, як індывідуальныя сялянскія гаспадаркі.

І недаацэнка значэньня індывідуальнага сэктару была-б буйнейшай палітычнай памылкай у нашай рабоце, у прыватнасьці ў нашай рабоце па разьвіцьцю жывёлагадоўлі. Вазьмеце, напрыклад, такую рэч, як кантрактацыя. Кантрактацыя цялят і іншых відаў жывёлы фактычна сарвана. Ёсьць раёны, дзе закантрактавалі ўсяго па аднаму цяляці на ўвесь раён. Вось, дзякаваць,—папрацавалі! Крэдыты на кантрактацыю далёка не скарысаны, і з гэтым становішчам трэба самым рашучым чынам пакончыць. Трэба стварыць рашучы пералом у організацыях, як у адносінах да індывідуальнага сэктару наогул, так і ў справе разьвіцьця і ўздыму жывёлагадоўлі ў індывідуальным сэктары сялянскае гаспадаркі. Канчаючы гэтую частку майго дакладу, я хачу спыніцца ў некалькіх словах на лёзунгу ліквідацыі кулацтва, як клясы, на аснове суцэльнай колектывізацыі і на тым, як праходзіла раскулачваньне па БССР. Сям-там праслізнула думка аб тым, што лёзунг ліквідацыі кулацтва не зьяўляецца больш асноўным лёзунгам партыі, што яго можна ўдакладніць, растлумачыць, паслабіўшы сэнс і значэньне гэтага лёзунгу. Лёзунг ліквідацыі кулацтва, як клясы, на базе суцэльнай колектывізацыі, застаецца асноўным лёзунгам партыі. У раёнах, дзе няма суцэльнай колектывізацыі, захоўвае сваю моц дапаможны лёзунг абмежаваньня і выцісканьня кулацтва.

У раёнах, дзе няма суцэльнай колектывізацыі, мы будзем пераходзіць да задачы ліквідацыі кулацтва, як клясы, па меры разгортваньня колгаснага руху. Адсюль вынікае задача ліквідацыі кулацкіх гаспадарак на аснове суцэльнай колектывізацыі пасобных вёсак і раёнаў. Мы прашлі паласу раскулачваньня, але нельга ўяўляць справу такім чынам што выселілі таго або іншага кулака і мы ўжо можам супакоіцца—мы ўжо ліквідавалі кулацтва, як клясу. Кулак у нас яшчэ застаецца і цяпер, вядзе нават больш упартую, больш чым раней, жорсткую барацьбу. Кулацтва моцна патрапана, эканамічныя пазыцыі кулацтва моцна паслаблены, але кулацтва, як кляса яшчэ не ліквідавана, кулацтва вельмі актыўна змагаецца супроць савецкай улады. Пасьля правядзеньня больш або менш дакладнага падліку, мы маем лічбы аб тым, што на тэрыторыі нашай рэспублікі раскулачана 15.629 кулацкіх гаспадарак. Усяго-ж у БССР налічваецца амаль 800.000 сялянскіх гаспадарак. Такім чынам раскулачаныя кулацкія гаспадаркі, у адносінах да ўсёй сумы сялянскіх гаспадарак на Беларусі, складаюць параўнальна нявысокі процант. Але з этых 15.629 кулацкіх гаспадарак у нас 2.393 гаспадаркі, г. зн. сёмая частка, раскулачаны няправільна. Гэтыя лічбы пераканальна гавораць аб тым, што пры правядзеньні раскулачваньня былі дапушчаны перагібы, якія білі па серадняку. Удар па аў на серадняка, ня гледзячы на тое, што па гэтым пытаньні дырэктывы і паказаньні былі даны ўсім дакладныя.

ЗАДАЧЫ ПАРТЫЙНЫХ ОРГАНІЗАЦЫЙ Ў ГАЛІНЕ ГАСПАДАРЧАЙ РАБОТЫ

Падагульняючы вынікі першай часткі дакладу, папрабую коратка ахарактарызаваць і задачы, якія стаяць перад партыйнымі організацыямі ў галіне гаспадарчай работы, па лініі прамысловасьці.

Па-першае — праводзіць далейшы цьвёрды курс на індустралізацыю і на павялічэньне ўдзельнай вагі прамысловасьці, разьвіваючы ў першую чаргу тыя галіны прамысловасьці, якія працуюць на мясцовай сыравіне (торф і н. б давучыя матар'ялы, прапрацоўка сельска-гаспадарчай сыравіны і інш.).

Па-другое, павысіць якасьць работы нашай прамысловасьці, дабіўшыся далейшых посьпехаў у справе зьніжэньня сабекошту і павышэньня якасьці прадукцыі.

Па-трэцяе, няўхільна клапаціцца аб павышэньні ўзроўню заработнай платы рабочых і аб палепшаньні рабочага забясьпечаньня.

У галіне сельскае гаспадаркі:

1) Дабіцца рашучага выпраўленьня лініі партыі, не дапускаючы як вагання ў галіне гаспадарчых адносін з серадняком, так і пасыўнасьці, дапусканьня раскол, што роўназначна аслабленьню радкоў раўніцтва соцыялістычнай рэконструкцыяй сельскай гаспадаркі.

2) Узьнімаць, разьвіваць і ўмацняць саўгасы, становішча якіх яўна нездавальняючае.

3) На аснове добраахвотнасьці разьвіваць далей колгасны рух, усямерна ўмацоўваючы яго. Дабіцца таго, каб колгасныя гаспадаркі зьяўляліся ўзорам, наглядна паказваючы перавагу колектыўнае гаспадаркі перад індывідуальнай гаспадаркай і на гэтай аснове забясьпечыць далейшае разгортваньне колгаснага руху.

4) Не дапускаць недаацэнкі індывідуальных сялянскіх гаспадарак, як яны яшчэ адыгрываюць вялікую ролю ў сельскай гаспадарцы рэспублікі.

5) Прыступіць да практычнага вырашэньня жывёлагадоўчай проблемы ў БССР, паставіўшы этую задачу, як адну з першачарговых задач партыйных організацый, уцягваючы ў этую справу ўсю масу колгасьнікаў. Дабіцца пералому ў разьвіцьці жывёлагадоўлі і індывідуальным сэктары сельскай гаспадаркі.

РОСТ АКТЫЎНАСЬЦІ РАБОЧАЕ КЛЯСЫ

У пэрыод паміж XII і XIII зьездамі КП(б)Б надзвычай ярка выявіўся рост актыўнасьці рабочае клясы, вытворчы ўздым і новыя формы падтрыманьня генэральнай лініі партыі, якія мы маем з боку рабочых:

Шырока разгарнулася соцыялістычнае спаборніцтва і як адно з яго яркіх праяўленьняў—ударніцкі рух. Аб глыбіні гэтага вытворчага ўздыму, аб уздыме актыўнасьці сьведчаць лічбы: на 160 буйных прадпрыемствах БССР з агульным лікам рабочых у 48 тысяч чалавек соцыялістычным спаборніцтвам ахоплена 75 проц. рабочых. На 135 прадпрыемствах, які налічваюць 43 тыс. рабочых, ва ўдарных брыгадах знаходзіцца 46,3 проц. агульнага ліку рабочых.

Гэта—справа шырокая, глыбокая, якая прасякнула ў тоўшчы рабочых мас,—не павярхоўная справа. Гэтаму вытворчаму ўздыму мы абавязаны тым, што вытворчыя програмы прамысловасьцю БССР выконваюцца параўнальна пасьпяхова. Без падтрыманьня рабочых, без актыўнасьці мас, без напружаных тэмпаў, гаспадарчага разьвіцьця мы не маглі-б выканаць.

Побач з буйнейшымі дасягненьнямі ў справе соцыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва ёсьць шмат адмоўных бакоў. Мы рашуча змагаемся з ілжэўдарніцтвам, рашуча змагаемся з фразёрствам і парадоксамі ў гэтай справе. Можна налічыць шмат прыкладаў, калі заводы называлі сябе ўдарнымі, уступалі ў соцыялістычнае спаборніцтва, а ў сапраўднасьці на гэтых прадпрыемствах нічога не зьмянілася, выкананьне прамфінпляну не пасунулася наперад.

Рост актыўнасьці рабочай масы паставіў перад масавымі організацыямі, перад парт'ячэйкамі на прадпрыемствах, перад профсаюзамі баявую задачу—здолець ахапіць гэты нябывалы творчы ўздым рабочай масы, організаваць і кіраваць ім.

Ці справіліся нашы масавыя організацыі, у прыватнасьці профсаюзы з гэтай задачай? Правільнай ацэнкай будзе адказ, што профсаюзы гэту задачу яшчэ ня выканалі, тварам да вытворчасьці яшчэ не павярнуліся.

Я, між іншым, закранаю гэту тэму, паколькі ў організацыйнай справаздачы ЦК КП(б)Б т. Васілевіч падрабязна спыніўся на гэтым пытаньні.

Мне здаецца, што профсаюзы цяпер перажываюць пераходны пэрыод. Тварам да вытворчасьці яшчэ ня здолелі павярнуцца, а са старых рэек таксама саскочылі і атрымліваецца так, што ня ведаюць, што рабіць і ня ўмеюць панова му рабіць. У некаторых выпадках профсаюзы ня ставяць, не сыгналізуюць пытаньняў, аб якіх трэба сваечасова сыгналізаваць і з пункту погляду забясьпечаньня правільнага ходу вытворчасьці і з пункту погляду абароны матар'яльнага становішча рабочых, якая ня зьнімаецца з профсаюзаў. Профсаюзы вельмі дрэнна і вельмі слаба сыгналізавалі ў апошні час аб цэлым радзе пытаньняў, у прыватнасьці аб пытаньні матар'яльнага становішча рабочых.

Рост актыўнасьці рабочае клясы БССР знайшоў сваё адлюстраваньне і ў прыцёку ў шэрагі комуністычнай партыі. За 1929 год у партыю было прынята 6459 чал., у тым ліку 5390 рабочых па соцыяльным паходжаньні, або 83,4 проц. Рабочых ад варштата было прынята 74 проц. з числа ўступіўшых. Першы квартал гэтага году (я маю даныя толькі за квартал а не за паўгодзьдзе) паказвае значнае павялічэньне прыцёку ў партыю і павышэньне числа уступіўшых рабочых ад варштата. Мы прынялі за чвэртку цяперашняга 1930 году больш палову таго, што было прынята на працягу ўсяго мінулага году—3932 чал., з гэтага ліку рабочыя па соцыяльным становішчы складаюць 89 проц., а рабочыя па роду заняткаў—81,4 проц.

Уздым актыўнасьці рабочых выявіўся і ў разгортваньні самакрытыкі. Лёзунг самакрытыкі не зьяўляецца новым лёзунгам для нашай партыі. Самакрытыка ёсьць пастаянны мэтад работы бальшавіцкай організацыі. Уладзімер Ільліч Ленін яшчэ ў 1904 годзе клікаў партыю да самакрытыкі, да бязьлітаснага выкрыцьця ўласных недахваткаў.

„Самакрытыка,—гаворыць т. Сталін,—ёсьць неадлучная і пастаянна дзейная зброя ў арсэнале бальшавізму і непарыўна зьвязана з самой прыродай бальшавізму і яго рэволюцыйным духам".

Ня гледзячы на тое, што партыя колькасна ўзрасла, ня гледзячы на тое, што яна ўцягнула ў свае шэрагі новыя тысячы, дзесяткі і сотні тысяч пролетараў, ня гледзячы на гэта,—адных сіл комуністычнай партыі ня хопіць для вырашэньня задач гаспадарчага будаўніцтва. Толькі ўцягнуўшы ў гэтую справу шырокія беспартыйныя пласты рабочае клясы, пры дапамозе, пры актыўным ўдзеле, пры непарыўнай праверцы з боку рабочых мас усёй гаспадарчай работы, усяго будаўніцтва, толькі пры гэтай умове партыя справіцца з тымі гістарычнымі задачамі, якія перад ёю стаяць і якія каротка можна ахарактарызаваць словамі: „задачы пабудовы соцыялізму".

Самакрытыка патрэбна дзеля таго, каб перамагаць інэртнасьць і бюрократызм, які гняздзіцца ў самых рознастайных апаратах, якія сустракаюцца і ў партыйным апараце, і ў савецкім, і ў гаспадарчым апараце і ў профсаюзным. Самакрытыка патрэбна дзеля таго, каб выправіць памылкі нашай работы і палепшыць справу нашага будаўніцтва. „Нам патрэбна,—гаворыць т. Сталін,—ня ўсякая самакрытыка, нам патрэбна такая самакрытыка, якая ўзьнімае культурнасьць рабочае клясы, разьвівае яе баявы дух, умацоўвае веру ў перамогу, памнажае яго сілы і дапамагае яму стаць сапраўдным гаспадаром краю". І таму ў справе кіраўніцтва разгортваньнем самакрытыкі асабліва значэньне набывае ўстаноўка на масы, на тое, каб шляхам самакрытыкі ўцягнуць і выхаваць мільённыя масы рабочае клясы, і, зразумела, шляхам самакрытыкі выхоўваць і выкоўваць асноўныя кадры нашай партыі. Цытую зноў т. Сталіна:

„Галоўнае,—гаворыць ён,—не падмяняйце масавай крытыкі зьнізу крытычнай траскатнёй зьверху. Дайце мільённым масам рабочае клясы ўцягнуцца ў справу і праявіць сваю творчую ініцыятыву ў справе выпраўленьня нашых недахопаў, у справе палепшаньня нашага будаўніцтва".

У справе самакрытыкі мы маем скажэньні двух радоў: зацiск самакрытыкі і выпадкі перахлёстваньня самакрытыкі. Абодва гэтыя скажэньні прадстаўляюць сабой опортуністычнае скажэньне лёзунгу самакрытыкі. Опортуністыя органічна супроць самакрытыкі. Опортуністыя асабліва тады супроць самакрытыкі, калі самакрытыка накіравана на абарону лініі партыі. Опортуністыя, як правіла, выступаюць у ролі зацiскачоў самакрытыкі, і яны зацiскаюць самакрытыку іменна там, дзе самакрытыка выхоўвае і ўцягвае шырокія рабочыя масы, бо опортуністыя па сваёй прыродзе супроць уцягваньня і прыцягненьня шырокіх рабочых мас, опортуністыя за габінэтнае вырашэньне пытаньня за адхіленьне рабочых мас ад творчага ўдзелу ў гаспадарчым будаўніцтве. А опортуністы нічога ня маюць супроць таго, каб скарыстаць зброю самакрытыкі супроць партыі. „Вось чаму,—чытаем мы ў адным з апошніх нумароў „Правды",—адзін і той-жа опортуністы можа, у залежнасьці ад умоў, выступаць то ў ролі зацiскача самакрытыкі, то ў ролі перахлёстваючага і выступаючага з антыпартыйнай крытыкай".

Вось, пад кутом погляду гэтых задач, падыйдзем да ацэнкі таго стану справы з самакрытыкай, які мы мелі ў нашай організацыі, і перш за ўсё паставім пытаньне: якога роду скажэньняў у справе самакрытыкі ў нас больш—зацiску або перахлёстваньня?

(Голас з месца:—зацiску).

Зусім правільна. З усёй акрэсьленасьцю трэба сказаць, што ў нас выпадкаў зацiску самакрытыкі было занадта многа. У мяне ёсьць цэлы сшытачак, дзе спрабавалі падлічыць выпадкі зацiску самакрытыкі. І гэты сшытачак атрымаўся даволі аб'ёмісты. Трэба мобілізаваць партыйную організацыю і на далейшы час на барацьбу з зацiскам самакрытыкі, даўшы ўстаноўку адносна таго, што ў нашай організацыі найбольш пашыраным скажэньнем лёзунгу самакрытыкі зьяўляецца зацiск самакрытыкі, і ў бліжэйшы час нашай організацыі трэба змагацца, галоўным чынам, з зацiскам самакрытыкі.

Толькі адну, найбольш характэрную справу з сэрыі спраў аб зацiску самакрытыкі, я лічу неабходным упамянуць зараз у справаздачы Цэнтральнага Камітэту,—гэта гомельская справа. У Гомелі мы мелі рад выпадкаў праследваньня рабкораў, праследваньняў паводле выдуманых, недарэчных і падтасаваных абвінавачаньняў. Бюрократычныя і опортуністычныя элемэнты ў гомельскай партыйнай організацыі на рабкораўскія выступленьні адказалі радам выпадкаў сапраўднага зацiску самакрытыкі, праследуючы рабкораў. І гомельскае акруговае партыйнае кіраўніцтва дапусьціла опортуністычную памылку (так ахарактарызавана была гэта памылка бюро ЦК і пастановаю ЦКК). Бюро гомельскага АК КП(б)Б не зразумела характару і сэнсу пытаньняў, якія перад ім сталі і фактычна стала на бок зацiскачоў.

Цэнтральны Камітэт даў правільную партыйную крытыку памылак Гомельскага кіраўніцтва і зрабіў рашучае абнаўленьне кіраўніцтва гомельскай акруговай партыйнай організацыі.

Нам і ў далейшым трэба мобілізаваць нашу партыйную організацыю на рашучае змаганьне з усякага роду праяўленьнямі зацiску самакрытыкі.

Ці досыць выстарчальна разгорнута ў нас самакрытыка? Не, таварышы, я лічу—далёка невыстарчальна. І галоўнае, калі мы паглядзім на тое, як наша самакрытыка разгортваецца пад кутом погляду тых партыйных установак, якія даны ў пастановах партыйных зьездаў, у прамовах т. Сталіна і ў іншых дакумантах партыі, тую ўстаноўку партыі, якую я коратка прабаваў падсумаваць тут, гаворачы аб задачах самакрытыкі, мы павінны будзем прызнаць, што самакрытыка ў нас разгорнута невыстарчальна і далёка не ў выстарчальнай ступені выконвае справу ўцягненьня шырокіх рабочых мас у соцыялістычнае будаўніцтва і ў справу выпраўленьня памылак у нашай рабоце. Мы павінны ўлічыць яшчэ і тое, што той, хто адстане ў справе разгортваньня самакрытыкі, той няўхільна адстане і ў справе разгортваньня соцыялістычнага будаўніцтва.

(Канец заўтра)

Ніводзін гэктар зямлі не павінен пуставаць

Прапануем наладзіць усебеларускі ўдарны комсамольскі двухтыднёвік па ліквідацыі прарываў на пасеўным фронце, які зьявіцца лепшым падарункам комсамолу 16-му зьезду УсеКП(б)

Сейце віку з аўсом, турнэпс, буракі, кукурузу, сланэчнік і гарох

ДВУХТЫДНЁВІК УДАРНАЙ РАБОТЫ

Ажыцьцяўленьне задач пастаўленых партыйнай перад веснавой пасеўкампаніяй зьяўляецца важнейшай умовай пасьпяховага ажыцьцяўленьня плянаў сацыялістычнага будаўніцтва. Друкуемыя сёньня сводкі аб ходзе севу паказваюць найвялікшыя дасягненьні рабочае клясы ў саюзе з асноўнымі масамі сялянства на гэтым важнейшым вучастку. Варожая агітацыя і дзейнасьць кулака, накіраваныя да зрыву пасеўкампаніі, да скарачэньня пасеўнай плошчы, волю рабочае клясы, волю колгасьнікаў, батрацкіх, бядняцкіх і серадняцкіх мас сялянства **аказалася біта**ю. Разьбіты пропаведзі опортуністых, як правага, так і «левага» толку. **Колгасы і бядняцка-серадняцкія масы сялянства вытрымалі баявы экзамен на фронце севу.**

Але-ж друкуемыя сёньня сводкі паказваюць, што яшчэ на сёньняшні дзень маецца больш 15 процантаў незасеянай пасеўнай плошчы прыгоднай для севу.

Такое становішча ставіць перад намі баявую задачу мобілізаваць зараз усе сілы з тым, каб на працягу бліжэйшых тыдняў ліквідаваць прарэхі на пасеўным фронце і дабіцца, ва што-б ні стала поўнага засеву застаўшыхся вольных плошчаў.

Нельга ні ў якім разе забываць, што засеў усёй плошчы, выкарыстаньне малейшага кавалачка годнай зямлі, зьяўляецца важнейшай умовай пасьпяховага выкананьня пяцігодкі.

Калі сёньня мы ня можам засеяць застаўшуюся плошчу зерновымі культурамі, мы можам і павінны яе засеяць культурамі для прыгатаваньня сілосаваных кармоў (вікай, сланэчнікам, кукурузай).

Комсамол пачаў вялікі паход за сілос. Значэньне гэтага паходу ў тым, што ён павялічвае кармавую базу для жывёлы, якая да гэтага часу была недастатковай і зьяўлялася адной з прычын у слабых тэмпах разьвіцьця жывёлагадоўлі. Значэньне гэтага паходу ў тым, што закладам сілосных ям і траншэй, мы пашыраем кармавую базу, гэтым самым ствараем неабходныя ўмовы ўзмоцненых тэмпаў разьвіцьця жывёлагадоўлі—вынаканьне важнейшай задачы партыі.

Разьвіцьцё жывёлагадоўлі—вялікі ўклад у пяцігодку. Мы павінны забясьпечыць неабходнымі харчовымі продуктамі горад—рабочую клясу.

Сілос—вялікі крок для павялічэньня кармавой базы, для забесьпячэньня ўмоў разьвіцьця жывёлагадоўлі.

Засеў застаўшыхся пасеўных плошчаў пад культуры годныя для сілосаваньня—**важнейшая і рэволюцыйная задача застаўшыхся тыдняў.**

Выкананьне гэтай задачы вялікі рэволюцыйны абавязак усёй савецкай грамадзкасьці і комсамол у гэтай справе павінен паказаць сваю рэволюцыйнасьць, павінен **зьявіцца ўдарнай групай у ажыцьцяўленьні баявой работы.**

Яшчэ можна выйграць два тыдні, каб не пакінуць ніводнага незасеянага кавалку зямлі, каб прынесьці 16 зьезду УсеКП(б) баявы рапарт аб засеве ўсёй пасеўнай плошчы, аб выкананьні плянаў пасеўнай кампаніі.

„Чырвоная Зьмена" ставіць пытаньне аб організацыі двухтыднёвіку засеву застаўшыхся незасеяных плошчаў. Комсамольская організацыя Беларусі павінна будзе падхапіць гэтую прапанову і з комсамольскім энтузіязмам, пад кіраўніцтвам партыі, па-баявому справіцца з гэтай задачай.

Усе савецкія і грамадзкія організацыі павінны адгукнуцца на нашу прапанову з тым, каб мобілізаваць усе свае сілы на поўны засеў пасеўных плошчаў.

Рэволюцыйная задача двухтыднёвіку павінна быць выканана.

Мы заклікаем нашых юнкораў да сваечасовай інформацыі газэце „Чырвоная Зьмена" аб ходзе севу.

Мы выклікаем усе цэнтральныя і акруговыя газэты на баявую організацыю і асьвятленьне ходу двухтыднёвіка.

Рэдакцыя „Чырвонай Зьмены".

Плян севу недавыканан на 16,4%

11,8 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак БССР, якія абʼядналі ў колгасах, колектыўна засеялі на 5 чэрвеня 365,023 га яравых культур, ці 84,5 проц. заданьня. Плян па збожжавых культурах выкананы на 93,3 проц.

Па асобных збожжавых культурах заданьні ня толькі выкананы але **і перавыкананы.** Так, напрыклад, па пшаніцы плян выканан на 101 проц., жыце—на 165 проц. (уключаючы і індывідуальны сэктар), і аўсу—колгасамі засеяна 127.138 га, ці 106 проц.

Колгасы Бабруйску і Менску —наперадзе

Шмат якія колгасы пляны паасобных культур далёка перавыканалі. Так, колгасы Бабруйшчыны заданьне па засеву пшаніцы перавыканалі на 106,2 проц., колгасы Меншчыны—на 42 проц.

Колгасы Мазыршчыны плян па засеву яравога жыта выканалі на 275 проц.

Гэтых дасягненьняў колгасы дабіліся дзякуючы таму, што з боку рабочае клясы, пад кіраўніцтвам КП(б)Б і УсеКП(б), праз 25-тысячнікаў рабочых мабілізаваных на работу ў калгасы, якія аказалі вялікую дапамогу колгасам у справе організацыі і правядзеньня вясеньняй сяўбы.

Колгасы ўспрынялі вопыт фабрык і заводаў, ужылі мэтады організацыі працы, ударніцтва і соцыялістычнага спаборніцтва.

6,7 проц. павінны прыкаваць нашу ўвагу

Прыведзеныя лічбы па засеву збожжавых культур з усёй яскравасьцю паказваюць, што падзеі нашых ворагаў і правых ухілістых на правал вясеньняга севу пацярпелі крах. Аднак плян па засеву збожжавых культур недавыканан на 6,7 проц.

Трэба з усёй рашучасьцю сказаць, што становішча па засеву тэхнічных культур (ільну і канопля) і сілосных культур (кукурузы, сланечнік) застаецца **напружаным.** Так на 5 чэрвеня плян па ільну па колгасным і індывідуальным сэктары выканан на 65,5 проц., па канопля—на 44,9 проц. Сілосных культур засеяна 32,3 проц. пляну.

Віцебск і Полацк,—вы ганебна адстаеце!

Асабліва дрэнна абстаіць справа з засевам ільну і канопля па асноўных ільнаводных акругах—**Полацкай і Віцебскай.** У першай—ільну засеяна на 5 чэрвеня 38,3 проц., у другой—45,8 проц.

Плян па засеву сілосных культур **выканала толькі адна Мазырская акруга (з перавышэньнем на 10 проц.),** астатнія акругі, асабліва Магілеўская, Гомельская і Аршанская—плятуцца ў хвасьце.

Такое пагражаючае становішча з засевам тэхнічных і сілосных культур патрабуе ад усіх мясцовых організацый найшпарчэйшай работы з тым, каб на працягу бліжэйшых дзён заданьні былі выкананы.

Пастанова СНК БССР аб ільготах кантрактуючым ільну і канаплі Віцебскім і Полацкім акрпаляводсаюзам і асабліва райпаляводсаюзамі не даведзены да колгасаў і індывідуальных гаспадарак.

Зямля не павінна адставаць!

Невыкананьне агульнага пляну вясеньняй сяўбы па БССР на 16,4 проц., з якіх колгасамі—на 15,5 проц., гаворыць аб тым, што **тысячы гэктараў зямлі застануцца пуставаць, калі колгасы і індывідуальныя гаспадаркі на працягу бліжэйшых дзён не прыступяць да іх засеву** такімі культурамі як віка з аўсом, сланечнік і кукуруза для сілосу, буракі, турнэпс і гарох.

Брадытная с.-гаспадарчая кааперацыя павінна зараз-жа забясьпечыць гэтымі культурамі колгасы і індывідуальны сэктар.

Выкананьне пляну сёлетняй пасеўкампаніі зьявіцца праверкай работы партыйных комсамольскіх, савецкіх організацый, наколькі яны ўдзельнічалі ў гэтай рабоце, наколькі яны перамаглі тыя цяжкасьці, якія меліся ў часе сяўбы.

Комсамольская ячэйка! Сявіцца з колгасу!—правядзем праверку наколькі вашы гаспадаркі выканалі пляны веснавое сяўбы. Неадкладна кінем усе сілы на **дапамогу індывідуальным бядняцка-серадняцкім гаспадаркам для засеву тэй плошчы, якая на сёньняшні дзень пустуе.**

Прарывы, якія маюцца на фронце засеву тэхнічных і сілосных культур, павінны ў бліжэйшыя дні быць ліквідаваны.

Канкрэтна мы прапануем організацыю двухтыднёвіка з тым, каб ніводзін гэктар зямлі не заўстаўся пуставаць.

Да 16-га партыйнага зьезду пасеўны плян павінен быць ня толькі выканан, але і перавыканан.

Х. Б.

Віцебск рапартуе

Ударныя групы спэцыялістых ужо прыступілі да працы. Шэраг аварыйшоў прынялі ўдзел у наведванні ўстановы акругі па пытаньню падрыхтаванасьці іх да сілосаваньня.

Другая група ўжо закончыла прапрацоўку інструкцый аб тэхніцы сілосаваньня ў адпаведнасьці з ўмовамі Віцебшчыны, якая будзе распаўсюджана сярод сялянства.

Трэцяя група ўжо скончыла прапрацоўку праграм для курсаў, якія будуць праведзены па акрузе.

Аднак, з боку акруговых установ усё яшчэ працягваецца злачынна безадказная адносіны да пытаньня сілосаваньня. Да гэтага часу ніводная з гэтых установ не перагледзела свае пляны ў бок іх павялічэньня, у адпаведнасьці з павялічанымі заданьнямі Віцебскай акругі.

Таксама і паасобныя раённыя комсамольскія організацыі не перахлючылі яшчэ сваёй працы на выкананьне заданьняў ЦК ЛКСМБ пабудаваць 30 сілосных ям кожнай ячэйкай. Лёзьненскі РК у сваёй пастанове лічыць патрэбным па ўсім раёне пабудаваць толькі 20 ям і траншэй, тады як па раёне налічваецца 20 комсамольскіх ячэек, і кожная з іх павінна па заданьню ЦК і АК КСМ пабудаваць 30 сілосных ям і траншэй.

Улічваючы такое становішча, АК ЛКСМБ намеціў наладзіць двохдзёньнік сілосаваньня па акрузе, галоўнай задачай якога—правесьці шырокую масавую праверку таго, што робіцца на мясцох і мобілізаваць вясковую грамадзкасьць на практычны ўдзел у організацыі працы і распаўсюджваньні літаратуры па сілосаваньню.

Для дапамогі ў правядзеньні двухдзеньніка сілосаваньня АК КСМ на ўсе раёны у дапамогу РК КСМ накірве брыгады з гарадзкіх комсамольцаў. Але вельмі тармозіць разгортваньне справы і тое, што ніякай літаратуры нідзе нельга дастаць па гэтаму пытаньню.

Нарэшце трэба адзначыць, што з падрыхтоўкай вызначанай колькасьці кадраў сілосных будаўнікоў справа абстаіць кепска. У асаблівасьці шкодзіць адсутнасьць пакаваньняў цэнтру ў пытаньні організацыі курсаў, бо курсы неабходна будзе правесьці ў парадку міжпар'я а падрыхтоўку неабходна распачаць зараз-жа інакш будаўніцтву ям можа пагражаць зрыў. Неабходна каб ЦК КСМ дабіўся з боку цэнтральных установ сваечасовых паказаньняў акругам.

З. Лосеў.



Падвозка гаручага для трактараў у савгасе імя 10-годзьдзя БССР

Брыгада на задворках

6 месяцаў таму назад комсамольская ячэйка мэханічнага цэху ф-кі „Спартак" (Шклоў) склала ўдарную брыгаду. Брыгада заключыла два соцдагавары з брыгадамі ф-кі „Гэрой Працы" і „Маліно". На вялікі жаль, брыгадай амаль што нічога ня зроблена для паказу ўдарнай працы.

Да працы адносяцца з халадком. За ўвесь час свайго існаваньня брыгада не зрабіла ні воднага сходу і аб ёй нагул мала хто ведае.

Цікава, што думае ячэйка? **А. Мяцеліца.**

Опэрацыйная зводка з пасеўнага фронту

Водлуг вестак Наркомзему на 5-е чэрвеня ў БССР было засеяна ярыны 1.951.310 га. ці 83,6 проц. з якіх у колгасах—365.023 га., ці 84,5 проц., індывідуальны сэктар—1.586.287 га ці 83,4 проц.

Трэба адзначыць, што паўднёвыя акругі—Мазырская і Гомельская, дзе сяўба фактычна ўжо канчаецца, значна адсталі ад больш паўночных акруг. Так, Менская акруга выканала плян сяўбы на 86,1 проц., Бабруйская—84,5 пр., Віцебская—77,6 проц., Полацкая—77,2 проц., Аршанская—85,7 проц., Магілеўская—82,4 проц. Мазырская акр. выканала толькі 81,6 проц. Крыху лепш справа стаіць у Гомельскай акрузе, дзе плян выканан на 89,2 проц. Магчыма, што за апошнія дні гэтыя дзьве акругі падцягнуцца, але пакуль што, мяркуючы па гэтых няспрыяючых паказчыках, трэба сыгналізаваць, што пляны па яравым ў гэтых акругах могуць быць недавыкананы.

Пакуль што напружаныя зьяўляецца справа на фронце сяўбы тэхнічных і сілосных культур. Па ільну плян выканан на 65,5 проц., па каноплях — 44,9 проц. Асабліва дрэнна стаіць справа ў Полацкай і Віцебскай акругах. У першай акрузе ільну засеяна—38,3 проц., у другой—45,8 проц. У Магілеўскай акрузе ільну засеяна 77 проц. пляна, згодна заданьня, Аршанскай—88, Мазырскай—92,7, Гомельскай—89,3, Менскай—66,8, Бабруйскай—73 проц.

Тут патрабуецца самая ўпартая, самая рашучая работа, каб у бліжэйшыя некалькі дзён скончыць поўнасьцю сяўбу ільну, трэба дамагчыся, каб да 15 чэрвеня плян па ільну быў выкананы.

Дрэнна стаіць справа з сілоснымі культурамі. На 5-е чэрвеня засеяна па БССР усяго 32,3 проц. ці 1.020,5 га, што безумоўна, зьяўляецца нездавальняючым. Менская акруга выканала плян па сілосных культурах на 60,4 проц. Бабруйская—49,3, Аршанская—41,4, Магілеўская—10,8, Гомельская—15,1. У Віцебскай акрузе засеяна 66 га, Полацкай—165 га. Толькі адна Мазырская акруга выканала свой плян з перавышкай на 110,3 пр.

Плян па гародніне выканан на 87,8 проц.: Менская—81,2, Бабруйская — 94,3, Мазырская—60,5, Віцебская — 71,6, Полацкая—94, Аршанская—122,1, Магілеўская—107 і Гомельская—81,6 проц.

Цмыхаўшчыну на чыстую воду

Артыкулы ў „Чырвонай Зьмене“ правільна сыгналізавалі аб прарывах у Менскай чыгуначнай дзевяцігадовай школе

Кіраўнікі школы, згубіўшы партыйную орыентацыю, зацiскалі самакрытыку, патакалі абывательскім і варожым настроям, якія праяўляліся ў школе

Кастрычнікаўскі райком КП(б)Б, заслухаўшы даклад аб становішчы школы, прыняў цэлы шэраг захадаў у тым ліку і організацыйных, якія павінны забясьпечыць неабходны пералом у рабоце школы

У свой час „Ч. З.“ зьмясьціла шэраг артыкулаў, якія сыгналізавалі аб буйных прарывах у рабоце чыгуначнай дзевяцігадовай школы імя Чарвякова.

Камісія Кастрычнікаўскага РК КП(б)Б, якая правяла агляд школы, цалкам пацьвердзіла правільнасьць нашых сыгналаў, як зусім правільна асьвятляўшых становішча школы.

Зараз мы маем магчымасьць зрабіць больш поўны аналіз работы школы і паказаць на прычыны, якія прывялі яе да надзвычайна дрэннага становішча.

Гэтая школа, як гаворыць пастанова Кастрычнікаўскага РК КП(б)Б,—„мае ўсе дадзеныя для таго, каб з посьпехам выконваць задачы партыі і сав. улады, якія ўскладаюцца на школу“.

Партыйнае і комсамольскае ядро сярод настаўніцтва складае[illegible] з 8 чал., у складзе вучняў—6[illegible] проц. рабочых, у школе ёсьць комсамольская ячэйка і даволі вялікая піонэрская організацыя. Беспартыйны актыў настаўнікаў складае 10 чалавек, школа мае добра прыстасаваны будынак, лябараторыі і г. д.

Аднак, пры ўсіх гэтых умовах, як у ідэолёгічным становішчы, так і ў вытворчай рабоце школы мы маем буйныя прарывы і скажэньні, прычыны якіх заложаны ў кіраўніцтве школай, як з боку партыйнай, комсамольскай ячэйкі і партыйнай часткі настаўніцтва, так і з боку аддзелу Нарасьветы.

Адной з галоўных прычын, што прывялі да такога становішча школу, зьяўляецца тое, што партыйная частка настаўніцтва ня толькі ня была на вышыні свайго становішча, а наадварот—альбо прымірэнча адносілася да шэрагу хваробных зьявішч, бязьдзейнічала ў школе, альбо, нярэдка, у той—ці іншай ступені сама ўдзельнічала ў стварэньні дрэннага становішча, заціскала самакрытыку, адміністравала над вучнямі, пазьбягала ўдзелу ў грамадзкай рабоце, душыла каштоўныя пачынаньні вучняў і, галоўнае,—ніякіх мер ня прымала да правядзеньня дыфэрэнцыяцыі сярод настаўніцтва, дзякуючы чаму паасобныя настаўнікі праводзілі ў школе ўсялякія варожыя тэорыі і тэорыйкі, якім не давалася патрэбнага адпору, аб якіх мы скажам ніжэй.

Ударныя брыгады прызнаны няжыцьцёвымі

Кіраўніцтва школаю, як з боку загадчыка (сябра партыі) т. Цмыха так і партыйнай часткі настаўніцтва найлепш характарызуецца становішчам акадэм-працы.

У гэтых адносінах, як зазначана ў пастанове РК КП(б)Б мы маем „рэзкае зьніжэньне акадэмічнае пасьпяховасьці, процант зьніжэньня па асобных дысцыплінах даходзіць да 25“. „Прычым, у параўнаньні з мінулым годам, акадэмічная пасьпяховасьць упала па ўсіх 3-х чвэртках гэтага навучальнага году. Прычыны галоўным чынам месьцяцца ў тым, што ў школе „слаба прымяняюцца актыўныя мэтады выкладаньня, ужываюцца ў большасьці старыя формы і мэтады, слаба праводзіцца распрацоўка вучэбнага матар'ялу брыгадным спосабам, што зьяўляецца простым зрывам дагаворy па соцыялістычнаму спаборніцтву ў галіне актывізацыі мэтадаў выкладаньня“.

У школе бадай што не праводзіцца соцыялістычнае спаборніцтва. Пачынаньні комсамольскай ячэйкі вучняў ў гэтым напрамку ня толькі ня сустрэлі ніякага падтрыманьня з боку настаўніцтва, а нават яно прызнала, што элемэнты спаборніцтва ўносяць разлад сярод вучняў, дзякуючы чаму заг. школы—Цмых—ударныя брыгады прызнаў ня жыцьцёвымі і разагнаў. Такім чынам, соцыялістычнае спаборніцтва ня толькі не зьяўляецца мэтадам штодзённай працы ў школе, але злачынна ігнаруецца кіраўніцтвам школы.



Загадчык школы тав. Цмых „выхоўвае“ крытычна думаючых асоб.

Дрэннаму становішчу акадэмічнай пасьпяховасьці ў вялікай меры спрыялі прагулы настаўніцтва, якія, па ўважлівых і няўважлівых прычынах, дасягалі нябачаных разьмераў. Так, у лютым м-цы прапушчана 65 гадзін, у сакавіку—74 гадзіны. Прычым 69 прапушчаных гадзін нікім не замяняліся і вучні ў гэты час гулялі. Вельмі багата пропускаў прыпадае на паасобных настаўнікаў, даходзячы да 131 гадзіны. Пачынаючы з 7-га верасьня, усяго па школе прагулаў—443 гадзіны. Гэтая лічба пабівае ўсялякі рэкорд галавацяпства і безадказнасьці.

Аб Цмыхаўскіх дэклямацыях і „установках“ Путніна

Паўстае пытаньне,—што-ж рабілі партыйцы, комсамольская ячэйка, мясцком, адміністрацыя школы, як яны рэагавалі на такое сапраўды пагражаючае становішча з акадэм-пасьпяховасьцю? На гэтае пытаньне можна даць адказ, калі разабрацца ў тых гутарках, якія хадзілі вакол яго ў школе разабрацца в тым, як рэагавалі на гэта і самае галоўнае,—аб гэтым з усёй яскравасьцю гаворыць становішча самакрытыкі ў школе. Разьбярэмся па чарзе.

Замест таго, каб згуртаваць увагу грамадскасьці на пытаньні акадэмічнай пасьпяховасьці, як парт. частка настаўніцтва, так і комсамольцы пляліся ў хвасьце, патуралі розным настроям, якія ўзьнікалі на гэтай глебе. Так, напрыклад, даволі шырока распаўсюдзіліся па школе гутаркі аб тым, што галоўная прычына непасьпяховасьці—гэта дрэннае фізычнае здароўе. Такое тлумачэньне ўзмоцнена дэкламавалася загадчыкам школы т. Цмыхам і падтрымоўвалася групай настаўнікаў.

Другога погляду прытрымліваўся Путнін, у яго на гэты конт меліся свае „установкі“. Па-першае, галоўным злом ён лічыць грамадзкую работу. Яго падтрымлівае Фідроўская і ей падобныя. Дарэчы кажучы гэтая „ўстаноўка“ культывавалася тэй часткай настаўніцтва, якая лічыла цяжарам грамадзкую працу і пад крыльцам партыйца Путніна ад яе рашуча адмахвалася (аб гэтым пісалася ў „Ч. З.“). Настаўнік Зарубін, такеама не без падтрыманьня з боку асобных настаўнікаў і нават т. Цмыха, разьвівае дзікую „тэорыю“, поўную панічных настрояў і беспэрспэктыўнасьці. Гэта тэорыя зводзіцца да таго, што «нарадзіўся нейкі новы вучань з страшэннымі вачыма, характэрнымі адзнакамі якога зьяўляюцца цынічныя адносіны да ўсяго, непаслушэнства, упартасьць, усязнайства і г. д. Ня будзем спыняцца на асаблівасьцях, якія характарызуюць «новага» зарубінскага вучня, скажам толькі, што такую клясыфікацыю ў школе дзе 65 проц. дзяцей рабочых можа праводзіць чалавек альбо з чужою клясавай закваскай альбо цяжка псыхічна хворы. Частка настаўніцтва асноўныя прычыны непасьпяховасьці знаходзіла ва ўзросьце, у дрэнным матар'яльным становішчы і інш.

Партыйцы настаўнікі, пэд. рада, комс. яч. пляліся ў хвасьце гэтых нездаровых, падчас абывацельскіх, і нават варожых настрояў, і ня толькі не давалі ім адпору, а ў большасьці патуралі, чым садзейнічалі росту ўпадніцкіх настрояў сярод настаўніцкага колектыву (настроі аб тым, што „настаўніцтва у загоне, настаўніка дзяўбуць, няма падручніка, рукі трасуцца“ і г. д.) і ўносілі дэзорганізацыю ў вучнёўскую масу. І гэта замест таго, каб рашуча ўзяцца за разгортваньне соцыялістычнага спаборніцтва, за актывізацыю мэтадаў выкладаньня, за стварэньне грамадзкай думкі, накіраваньне ініцыятывы вучняў на вырашэньне гэтай важнай задачы.

Комсамольская ячэйка, замест таго, каб на грунце разгортваньне самакрытыкі, разьвіцьця сацыялістычнага спаборніцтва, згрупаваць увагу комсамольскай, піонэрскай організацыі і вучнёўскай масы на пытаньнях акадэм-працы, замест таго, каб паставіць гэта пытаньне як стрыжань у сваёй працы, займалася пудрай, дробнымі пытаньнямі мяшчанства, прагледзеўшы за гэтым грубыя мяшчанска - абывательскія адносіны настаўніцтва і шэрагу вучняў да акадэмічных пытаньняў.

Душылі ўсялякі крытычны голас

Усе прарывы дапушчаны ў школе ў значнай ступені дзякуючы адсутнасьці і ня толькі адсутнасьці, а заціску самакрытыкі.

Самакрытыка не зьяўлялася мэтадам у штодзённай рабоце школы. Усякія крытычныя галасы бязьлітасна заціскаліся.

Мы ўжо прыводзілі шэраг фактаў, як разуменьня сутнасьці, так і адносін да самакрытыкі, як загадчыка так і іншых настаўнікаў школы. Аднак, для таго, каб больш уявіць разуменьне самакрытыкі і адносіны да яе з боку кіраўніцтва школы падамо вытрымку з „установкі“ заг. школы Цмыха аб ролі і месцы самакрытыкі ў школе. „Самакрытыка ў школе соцвыху не падпарадкавана прынцыпам самакрытыкі на вытворчасьці і ў другіх установах, тут маецца свая спэцыфічнасьць. Самакрытыка ў школе соцвыху не павінна быць ідэёвым і кіраўнічым момантам у пэдагогічных процэсах, але пэдагогічны процэс павінен выхоўваць і афэрмляць крытычна думаючыя асобы.

Вось „тэорэтычнае“ абгрунтаваньне практыкі заўзятага заціскача самакрытыкі. Хаця ад гэтай „установкі“ пад націскам РК КП(б)Б, т. Цмых адмовіўся, аднак, гэтая „установка“ чырвонаю ніткаю праходзіць праз усю практычную дзейнасьць школы.

Гэта сьцьвярджаецца фактамі, якія мы прыводзілі ў артыкуле: „Жыў гогалеўскі гараднічы“. Гэта з усёй яскравасьцю падкрэсьлена ў пастанове РК КП(б)Б, дзе гаворыцца, „што крытыка і самакрытыка сярод вучнёўства адсутнічае. Калі на піонэрсходзе вучаніца выступіла з заявою аб тым, што настаўнік называе вучняў „падлам“ (настаўнік Зарубін), і калі яе папрасілі вучні назваць прозьвішча настаўніка, дык Цмых сказаў, што ня трэба гэтага рабіць, тав. Путнін заяўляе, што ён не дазволіць вучням крытыкаваць сябе з ідэолёгічнага боку. Калі вучні гаварылі аб ідэолёгічных вывіхах настаўніцы Фідроўскай, дык Путнін сказаў: „Трэба ўздуць гэтых вучняў“.

Усё гэта прымусіла РК КП(б)Б у сваёй пастанове констатаваць, што ў школе — „заціск самакрытыкі, скажэньня самага сэнсу разуменьня самакрытыкі“.

У значнай частцы дзякуючы заціску самакрытыкі ў школе ўжываліся і пісаліся ў вытворчых плянах тэрміны з яўна нацыяналістычным, нацыянал-дэмократычным адценьнам, накшталт: „зьдзекі амэрыканцаў над нэграмі“, „барацьба беларусоў за сваё вызваленьне“, „эксплёатацыя расійцамі беларусоў“.

Толькі дзякуючы заціску самакрытыкі ня было раскрытыкавана яўна правае выступленьне Путніна, якое зводзіцца да таго, што „партыя аддае індустрыі ўсё, а школьнаму бюджэту нічога“. Хаця пакутках аб гэтым і гаварылі.

Да рэчы кажучы гэты-ж Путнін увёў у заблуджэньне газэту «Зьвязду», дзякуючы чаму ў апошняй быў зьмешчан артыкул, ялі непраўдлова асьвятляў становішча школы.

Вынікі заціску самакрытыкі

Заціск самакрытыкі даў свае вынікі і ў тым, што „дыфэрэнцыяцыя настаўнікаў праведзена недастаткова і што вакол правядзеньня дыфэрэнцыяцыі ня было адзінай думкі паміж настаўнікамі комсамольцамі і партыйцамі“. (З пастановы РК КП(б)Б).

І гэта ў значнай меры з тае прычыны, што паасобныя партыйцы (Путнін, Цмых) бралі пад абарону настаўнікаў, якія давалі політычна-шкодныя ўстаноўкі (Фідроўская), нават блёкаваліся з клясава-варожымі элемэнтамі, аб чым, як гаворыць рашэньне РК КП(б)Б,—„сьведчыць факт прыняцьця на работу ў школу загадчыкам Цмыхам настаўніка Стахоўскага, зьнятага з пасады загадчыка апорнай школы, як выкрыўляўшага клясавую лінію ў працы; выдача загадчыкам школы Цмыхам няпраўдзівай даведкі Стахоўскаму аб аслабаненьні яго ад заняткаў у АБВШ, як камандыраванага па справах школы ў Маскву“.

Мы лічым лішнім супыняцца на другіх хваробных баках і дробных пытаньнях становішча школы, бо яны даволі ясна былі высьветлены ў папярэдніх артыкулах, зьмешчаных у нашай газэце аб гэтай школе. Пастановай РК КП(б)Б прызнана, што артыкулы: „у асноўным правільна сыгналізавалі аб становішчы школы і ўскрывалі шэраг прарываў, меўшых месца ў рабоце школы і асобных яе кіраўнікоў“.

Становішча ў школе імя Чарвякова зьяўляецца клясычным прыкладам таго, як кругавая парука, страта партыйнай орыентацыі, а адсюль—заціск самакрытыкі, блёкаваньне з варожымі элемэнтамі асобных гора-кіраўнікоў могуць прывесьці да сур'ёзных політычных прарываў у школе, што ў сваю чаргу надзвычайна дрэнна адбілася, як на акадэмічнай рабоце, так і на ідэолёгічным выхаваньні мас вучнёўства.

Зрабіць вывады дзейснымі

Гэтымі днямі Кастрычнікаўскі РК КП(б)Б, па дакладу камісіі аб аглядзе школы, вынес вычэрпныя рашэньні, якія даюць поўную ацэнку становішчу школы. РК КП(б)Б ужыў організацыйныя меры да членаў КП(б)Б, якія, будучы ў кіраўніцтве школай, давялі яе да такога становішча. У прыватнасьці РК КП(б)Б абвесьціў вымову бюро парт. ячэйкі, загадчыку школы т. Цмыху абвешчана таксама суровая вымова члену КП(б)Б—Лісейчыку. РК пастанавіў на від т. Новіку і т. Путніну, узьняўшы пытаньне перад адпаведнымі органамі аб пераводзе Путніна ў другую школу.



«Новы» вучань ва ўяўленьні настаўніка Зарубіна.

Усе гэтыя мерапрыемствы павінны забясьпечыць найхутчэйшы пералом у рабоце школы. Аднак, гэтыя меры ня будуць мець дзейснага значэньня, калі парт. яч., комсамольская організацыя, (РК і ячэйка) і асабліва органы Нарасьветы ня прымуць патрэбных захадаў да штодзённага нагляду і кіраўніцтва школай. Органам Нарасьветы, акрамя бясспрэчна неабходнага ўзмацненьня кіраўніцтва ўсімі і асабліва акадэмічнымі процэсамі працы школы, неабходна зараз-жа ачысьціць школу ад элемэнтаў, якія ня месца ў шэрагах савецкага настаўніцтва.

Васіль Самуцін

Аматары гасьцеўшчыны з Менскага Цэрабкопу

Разьвальваюць адзіную ў Менску школу падрыхтоўкі кадраў гандлёвых працаўнікоў—канторвуч

Васеньні набор у фабзавучы—не за гарамі. Акругкомы, райкомы, ячэйкі, хутчэй уключайцеся ў соцспаборніцтва на лепшае праводзеньне набору!

МЦРК расправіўся з канторвучам

Проблема кадраў зьяўляецца вузкім месцам і для кооперацыі. Зараз адчуваецца надзвычайны нелахоп у гандлёва-кооперацыйных работніках сярэдняй кваліфікацыі,—не хапае прадаўцоў, рахункаводаў, ня кажучы ўжо аб вышэйшых кваліфікацыях, як эканомісты, якіх выпускае ВНУ.

Як-жа кооперацыя вырашае пытаньне кадраў? Буйное павялічэньне колькасьці крам (амаль на 200 проц.) расьцела зьянацку некаторыя кооперацыйныя організацыі. Школу канторвуч, якая прызвана лепшай сыстэмай падрыхтоўкі гандлёва-кооперацыйных кадраў, гаспадарнікі забылі. Яе ігнаруюць на кожным кроку.

Вось, напрыклад, у Менскай школе канторвуч з 120 вучняў у пачатку навучальнага году засталося 70, з тае прычыны што з лёгкай рукі адміністрацыі МЦРК праведзена разброняваньне, уведзена ў штат пасьля 3х-месяцаў вучобы, бо ім не падабаюцца такія тэмпы (двухгадовы тэрмін навучаньня ў школе).

Узамен гэтага (школы канторвучу) праўленьне МЦРК „вынайшла“ новы мэтад падрыхтоўкі кооперацыйнай сілы—так званы мэтад „практыканства“. Робіцца гэта так: набіраюць людзей з біржы, некваліфікаваных, у большасьці напісьменных і яны, на працягу месяцу альбо 3-х тыдняў, праходзяць практыку, а потым „выпускаюцца“ гатовымі прадаўцамі-кооператарамі.

Аб якасьці гэтых „кооператараў“ лепш за ўсё скажуць словы аднаго загадчыка крамы:—„Іх можна назваць прадаўцамі, як Магдональда комуністым“. Іх амаль штодзённа перакідаюць з адное крамы ў другую, бо нідзе іх ня хочуць прыймаць. Даводзіць аб нікчэмнасьці такой падрыхтоўкі гандлёвых працаўнікоў наўрад ці трэба. Яна поўнасьцю адпавядае прынцыпам „гасьцеўшчыны“, супроць чаго мы і рашуча выступаем

Мы за канторвуч!

Г. К-г.



МЦРК, о слаўны ЦРК!
За тэмпы ён
У падрыхтоўцы кадраў!
Глядзі, чытач:
„Старанная“ рука
Канторавуч
Урэзвае з пагардай!
Канторавуч—
„Даўжэзныя“ гады—
Канторавуч
Перарабілі ў курсы,
З якіх выходзяць
Сотні маладых—
Для біржы працы
„Моцныя“ рэсурсы.

Зьм. С.

Падрыхтоўваемся да набору

З мэтаю падрыхтоўкі да новага набору ў школы фабзавучу Магілеўскае АПБ яшчэ ў маі месяцы організавала 4-месячныя падрыхтоўчыя курсы для будучых фабзайцаў на 105 чалавек. На 55 чалавек у Магілеве і на 50 чалавек у Шклове, пры папяровай фабрыцы «Спартак».

Прымаюцца на курсы выключна дзеці рабочых, беспрацоўныя падлеткі, якія знаходзяцца на біржы, і выхаванцы дзіцячых дамоў в 15—17 гадовым узростам.

Ф. Хазанаў.

Падтрымаць карысны пачын

Завод імя Ланцуцкага (Гомель) адчувае вялікі недахват кваліфікаванай рабочай сілы. Школа ФЗВ, якая існуе пры заводзе, ні ў якім разе не можа забясьпечыць поўнасьцю патрабаваньні заводу, асабліва на сьлесараў і кавалёў. Па ініцыятыве бюро комсамольскага колектыву і школы фабзавуча заводу імя Ланцуцкага організуюцца як часовая мера 4-хмесячныя курсы з чорнарабочых па падрыхтоўцы кваліфікаваных сьлесараў.

Цяга на курсы з боку чорнарабочых і асабліва моладзі вялікая. Курсы разьлічаны на 60 асоб, а ўжо падана 138 заяў. Становішча з кадрамі на заводзе з усёй настойлівасьцю патрабуе хутчэйшага пашырэньня школы ФЗВ.

Комсамольскі колектыў павінен гэтага дабіцца,

Брыгадзір „Чырвонай Зьмены“ БЭДЫНЭРМАН.

На Віцебскай чыгунцы зрываецца набор

Справа з падрыхтоўкай кваліфікаванай рабочай сілы на віцебскім вузьле МББ чыгункі абстаіць дрэнна. Становішча школы фабзавучу надзвычайна цяжкае. Школа зьмяшчаецца ў бараках. Не адпавядаюць сваёй якасьцю майстэрні, дзе вучні праходзяць практыку. З 100 вучняў школы толькі 8 чалавек забясьпечаны агульнажыцьцем.

Гэта адзначалася ў мінулым годзе. Праведзены сёлета агляд выявіў такое-ж самае ненармальнае зьявішча. Адносіны профсаюзных і іншых грамадзкіх організацый, у тым ліку і дарожнага аддзелу кадраў, самыя нядбайныя.

Усё гэта ставіць пад пагрозу зрыву надыходзячы асеньні набор, які павінен уліць у школу новых 70 чалавек.

У. Мацкевіч.

У ПАХОД ЗА СІЛОС

Зусім бясспрэчна, вялікая важнасьць пытаньня жывёлагадоўлі для Беларусі, вырашэньне якога немагчыма без вырашэньня кармавога пытаньня.

А між тым, у нас з кармовым пытаньнем справа абстаіць з рук вон дрэнна.

У лепшыя ўраджайныя гады мы кармілі кароў пераважна ярвовай саломай і дрэнным асакістым сенам, а толькі-толькі песарод траў—жывёла харчуецца саламянай стрэхай і гіне ад бяскорміцы.

У лепшыя гады была трымацца зімою выключна на сухіх кармох, улетку—на худых пашах, але толькі недарод—і жывёла ў масавай колькасьці пападае ці на бойню, ці да кулака і перакупшчыка. Такім чынам, бядняцкія гаспадаркі трацяць апошнюю жывёліну.

Так было.

Ці непазьбежна такое становішча? Не, яно непазьбежна.

І ў момант, калі мы пачынаем перабудоўваць нашу сельскую гаспадарку на новых колектыўных пачатках, калі мы яе індустрыялізуем, калі і глеба і людзі прад'яўляюць павышаныя патрабаваньні да жывёлагадоўлі і яе продуктам, мы павінны рашуча, па-рэволюцыйнаму, вырашыць кармовае пытаньне, стварыць цьвёрдую аснову для жывёлагадоўлі.

Мы павінны і ў гэтым пытаньні ісьці бальшавіцкімі тэмпамі. І мы маем гэтую магчымасьць.

Тэхніка здабываньня корму дазваляе нам ужо ў бягучым годзе на 100 процантаў вырашыць кармовае пытаньне ў Беларусі.

Мы маем праверанае мерапрыемства, якое дапушчае ўжо ў бягучым годзе падвоіць нашыя кармовыя рэсурсы і, аднагасова, значна палепшыць якасьць кармоў.

Гэта мерапрыемства—сілосаваньне кармоў.

У мудроным слове—сілосаваньне хаваецца надта простая і знаёмая нам справа.

Слова гэта азначае проста квашаньне кармоў.

Мы квасім капусту на зіму, солім гуркі, але ўсё гэта для людзей.

А зараз нам час падумаць аб тым, каб квасіць корм і для жывёлы.

Аграном Колгасцэнтру.

(*Працяг будзе*)

Пілсудчыкі „дзейнічаюць“...

Варшаўскія газэты пагавораюць аб пралогу вялікай драмы, якая павінна разыгрывацца ў будучым на польска-савецкай граніцы

ВАРШАВА, 12. Выкрыцьці аб пятлюраўска-пілсудчыкаўскіх махінацыях ідуць адно за другім. Гэтымі днямі ўжо паведамлялася адносна дагавору, заключанага між генэралам Сальскім і Слявекам Юзэфскім. Пілсудчыкі, імкнучыся пашырыць „базу польска-украінскага саюзу“, вядуць ажыўленыя перамовы таксама і з УНДО, каб уцягнуць апошняе канчаткова ў арбіту польскай політыкі.

„Рускі Голас“ паведамляе, што між польскім урадам і УНДО была дасягнута прынцыповая згода ў часе нядаўняга прабываньня Юзэфскага ў Львове. УНДО прад'явіў рад умоў: амністыя для політзьняволеных, аўтаномія школы, унівэрсытэту, перадача ўндоўцам народнага дому і г. д. аб дзейнасьці Юзэфскага і якасьці міністра ўнутраных спраў адна з варшаўскіх газэт піша наступнае: „усю сваю дзейнасьць па нацыянальнаму пытаньню ў міністэрстве ўнутраных спраў Юзэфскі лічыў пралогам вялікай драмы, якая павінна разыгрывацца ў будучым на польска-савецкай граніцы“.

Нячуваная ў гісторыі расправа над комуністамі

ВАРШАВА, 12. Львоўскі суд вынес учора нячуваны нават у гісторыі судовай расправы з комуністамі ў Польшчы прыгавор, на падставе якога трое падсудных Гірш, Пропер і Югер ва ўзросьце ад 22 да 24 год, прыгавораны за распаўсюджваньне нелегальнай літаратуры да сьмяротнага пакараньня праз павешаньне.

Паліцыя працуе...

ВАРШАВА, 11. Паліцыя арыштавала ў Варшаве 12 членаў саюзу незалежнай соцыялістычнай моладзі па абвінавачаваньню ў комуністычнай агітацыі сярод вучняў сярэдне-навучальных установаў.

Працэс 24-х

ВАРШАВА, 11. У акруговым судзе ў Сасноўцы пачынаецца працэс 24-х рабочых, арыштаваных паліцыяй у час расстрэлу беспрацоўных у Олькушы 9-га красавіка.

Генэральскія баі ў Кітаі

ПЭЙПІН, 10.—Паведамленьні з кітайскіх крыніц падцьвярджаюць захоп Іочжоў (на поўшляху паміж Ханькоў і Чанша) гуансійскімі войскамі. Па гэтых крыніцах, падзеньне Ухану (агульная назва гарадоў Ханькоў, Ухану і Ханьяну) чакаецца на працягу тыдню. Жалезная дывізія (Чжан-Фа-Гуя) хутка ўварвецца ў провінцыю Цзянсі. На Лунхайскім фронце спакойна. Абодва варожыя бакі чакаюць разьвіцьця здарэньняў у Шандуні і Хубэі. Цзынань (галоўны горад Шандуня) усё яшчэ знаходзіцца ў руках Хан-Фу-Чу (староньніка Нанкіна), аднак, па зацьверджаньню паўночцаў вядуцца перагаворы аб здачы Цзынані бяз бою.

Папраўка

У нумары 134 „Ч. З.“ ад 12-VI, у рэзолюцыі бюро ЦК ЛКСМБ аб перавыбарах бюро і камітэтаў, у апошнім пункце дапушчана яўна няправільная формулёўка, якая сьцьвярджае, што на конфэрэнцыях непролетарскіх раёнаў дапускаецца выстаўленьне сьпісаў.

Такая пастаноўка пытаньня груба памылковая і ідзе ў разрэз з прынцыпамі саюзнай дэмократыі.

Гэтая ўстаноўка мелася ў прадстаўленым праекце рэзолюцыі і была адвергнута бюро ЦК ЛКСМБ, аднак, па тэхнічнаму недагляду ў ЦК, не была выкрэсьлена пры канчатковым рэдагаваньні.

Растлумачваецца, што апошні пункт рэзолюцыі патрэбна чытаць: „Устанавіць, як правіла, што высоўваньне папярэдніх сьпісаў з намечанымі кандыдатурамі ў бюро і камітэты ні ў якім выпадку не дапускаецца“.

ЦК ЛКСМБ.

Паведамленьне

Рэдакцыя газ. „Чырвоная Зьмена“—15-га чэрвеня г. г., а 7 гадз. увечары, у памяшканьні Выдавецтва „ЧЗ“ (комсамольская 25), склікае нараду ўпаўнаважаных „ЧЗ“ ад навучальных установаў.

На нараду павінны зьявіцца ўпаўнаважаныя „ЧЗ“: 1. Школы швейнікаў, 2. Школы будаўнікоў, 3. Белпэдтэхнікуму, 4. Польпэдтэхнікуму. 5. Агульна-адукацыйных курсаў, 6. 2-х гадовых пэдкурсаў, 7. Музтэхнікуму, 8. Курсаў актыву (Камвуз), 9. Політэхнікуму, 10. Прафшколы хэмікаў, 11. Дашкольнага тэхнікуму, 12. МШУ., 13. Курсаў па падрыхтоўцы у ВНУ, 14 Белдзяржунівэрсытэту: ад пэдфаку, мэдфаку, паргасу, хэмфаку, рабфаку, савбуду, 15. Яўпэдтэхнікуму, 16. Мэдшколы, 17. Аб'яднанай профшколы.

Рэдакцыя газэты „Чырвоная Зьмена“.

Пленум ФРК ЛКСМБ

Сёньня ў Доме Комсамолу, а 6-ай гадзіне ўвечары, адбудзецца Пленум ФРК ЛКСМБ сумесна з членамі бюро ячэйкі.

Парадак дня:

1. Аб самаправерцы.
2 Аб перавыбарах бюро ячэек.

Адказны рэдактар Рэдколегія

Згублены

— Спраўка аб працы на імя Ормана Л. У., выд. Будвуч. Белдзяржбуду.

— Біржавая картка на імя Кабакова З. З., выд. Барысаўскай біржай працы.

— Біржавая картка на імя Батачэнка Н. В., выд. юнсэкцыяй біржы працы.

— Кніжка на атрыманьне грошай на новароджанага, выд. Койданаўскай страхкасай на імя Кавалевай В. Д.

— Біржавая картка за № 2480 на імя Левінай З. Л., выд. юнсэкцыяй біржы працы.

— Біржавая картка за № 5101 на імя Фрыдмана Р. Е., выд. юнсэкцыяй біржы працы.

— Кніжка с-г. т-ва № 4526 на імя Райхельсон М. А., выд. Барысаўскім сельгаставарыствам.

— Кніжка, выд. Барысаўскім камітэтам узаемадапамогі на імя Аўчыньнікава Я. П.

— Біржавая картка на імя Докукі Вольгі А., выд. Барысаўскай біржай працы.

Галоўлітбел № 500

Менск, друкарня БДВ імя тав. Сталіна